УДК 808.26-3 (043.3)

# Беларуская будаўнічая тэрміналогія: лексіка-семантычныя групы назоўнікаў

Пятрова Н.Я.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Беларуская будаўнічая тэрміналогія аб'ядноўвае спецыяльныя найменні для абазначэння будаўнічых матэрыялаў і вырабаў, прылад працы, механізмаў, машын, прыбораў і прыстасаванняў, тэхналагічных аперацый і вытворчых працэсаў, аб'ектаў жыллёвага прызначэння, асобных памяшканняў і іх элементаў, дэталяў і інш.

Тэрміны ў галіне будаўніцтва не існуюць ізалявана адзін ад аднаго, а аб'ядноўваюцца ў групы паводле лексіка-семантычных уласцівасцяў. Сярод будаўнічых тэрмінаў-слоў прыярытэтнае месца займаюць тэрміны-назоўнікі наступных лексіка-семантычных груп:

1. Лексіка-семантычная група (далей ЛСГ) слоў, што абазначаюць назвы прыстасаванняў і машын: *асфальтаўкладчык, бетоназмешвальнік, вільгацямер, землечарпалка, млын, пад'ёмнік* і і нш.

2. ЛСГ слоў, якія абазначаюць назвы ўласцівасцяў прадметаў і з'яў: *бурымасць, вязкасць, гіграскапічнасць, дробнасць, крохкасць, моцнасць, насычанасць, пругкасць, шчыльнасць, яркасць* і інш.

3. ЛСГ слоў, якія абазначаюць назвы дзеянняў, працэсаў і станаў: *адсорбцыя, асадка, бурэнне, вымярэнне, гідраізаляцыя, запампоўка, мацаванне, нацяг, скос, сцёк, сцяжка, умацаванне, уцяпленне* і інш.

4. ЛСГ слоў, якія абазначаюць назвы рэчываў і матэрыялаў: абмазка, азбашыфер, азбакардон, азбест, амінапласт, асфальт, базальт, *бардалін, бялілы, вапняк, газашкло, гіпсакардон, мармур, эмалі* і інш.

5. ЛСГ слоў, якія абазначаюць назвы спецыяльных прадметаў: *бэлька, кандыцыянер, каштарыс, лесвіца, панель, спружына, шафа, шпінгалет, этажэрка* і інш.

6. ЛСГ слоў, якія абазначаюць назвы месцаў, што ўтвораны ў выніку пэўных дзеянняў: *выгін, запіл, насечка, прагіб, шчыліна* і інш.

7. ЛСГ слоў, якія абазначаюць назвы інструментаў: *абціскач, варштат, вастрагубцы, калёўка, кроква, круглагубцы, разьбарэз, рыштаванне, свярдзёлак, скрабло, станок, шпатэль, штапік* і інш.

8. ЛСГ слоў, якія абазначаюць назвы прафесій і сфер дзейнасці: *аддзелачнік, бетоншчык, геадэзія, геадэзіст, дойлід, цясляр* і інш.

9. ЛСГ слоў, якія абазначаюць назвы будынкаў, памяшканняў, частак будаўнічых канструкцый: *альтанка, вежа, веранда, дах, забудова, збудаванне, катэдж, кацельня, кватэра, лазня, маёнтак, паверх, падлога, падмурак, пакой, склеп, столь, страха* і інш.